Дадатак

| Месяц, калі выдадзены | Вокладка (фота) | Назва метадычнага выдання, анатацыя, адказны за выпуск, кантакты |
|---|---|---|
| Сакавік |  | **“Сцежкамі фальклору Астравеччыны. Легенды, паданні, казкі”**<br>Беларускі фальклор прадстаўлены амаль усімі жанрамі: каляндарная і сямейна-абрадавая паэзія, казкі, паданні і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы, народны тэатр у розных яго відах, сацыяльна-бытавая лірыка. Не стаў выключэннем у дадзеным накірунку і Астравецкі раён.<br>Падзяліць вусныя народныя творы па часе іх з’яўлення немагчыма, бо ў адным і тым жа творы можна знайсці нешта ад розных часоў, сувязь мінуўшчыны з цяперашнім жыццём. Таму лепш разглядаць паасобна віды вуснай народнай творчасці.<br>У другі метадычны выпуск уключаны вынікі апошніх фальклорных экспедыцый: легенды, паданні і казкі Астравеччыны. Пры знаёмстве са зместам дадзенага зборніка можна ўбачыць і параўнаць спецыфіку гутаркі ў Астравецкім раёне, дазнацца пра мясцовыя гістарычныя падзеі і пазнаёміцца з рэгіянальнымі героямі таго часу.<br>*Метадычны аддзел ДУ “Астравецкі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”; 8(01591)75220* |

| | | |
|---|---|---|
| Ліпень |  | **“Сцежкамі фальклору Астравеччыны. Мікратапонімы”**<br>Мікратапонімы ўзніклі ў глыбокай старажытнасці. Жыццёвыя абставіны змушалі чалавека адрозніваць адзін прыродны аб’ект ад другога. Міналі стагоддзі, колькасць мікратапонімаў няўхільна расла. Астравеччына ў дадзеным накірунку не з’яўляецца выключэннем.<br>У дадзеным выпуску мы звярнуліся да аналізу мікратапонімаў Астравецкага раёна. У выніку захавання культурнай спадчыны ёсць пільная патрэба ў фіксацыі і апрацоўцы матэрыялу па мікратапаніміцы.<br>Па-першае, назвы аб’ектаў адлюстроўваюць мысленне тых людзей, якія раней жылі на тэрыторыі раёна. Праз мову выяўляецца светабачанне продкаў.<br>Па-другое, у краіне шырока развіваецца этнатурызм. Нашым Астравецкім раёнам цікавяцца турысты з розных рэгіёнаў. А каб было што расказаць госцю, трэба дасканала валодаць гісторыяй роднага краю.<br>Хоць даследаванняў па мікратапаніміі Беларусі шмат, але ж Астравеччына застаецца “патаемнай скарбонкай” у дадзеным накірунку. Таму наш зборнік прысвечаны збору і вывучэнню мікратапонімаў малой радзімы.<br>*Метадычны аддзел ДУ “Астравецкі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”; 8(01591)75220* |

| | | |
|---|---|---|
| Лістапад |  | **“Народныя мастацкія рамёствы Астравеччыны”**<br>Ткацтва, вышыўка, саломапляценне, выцінанка, мастацкая кераміка, роспіс, вязанне – усе гэтыя віды рамяства раней былі вельмі распаўсюджанымі ў побыце сялян астравецкага краю. Рамеснікі стваралі неабходныя для жыцця рэчы, рэалізуючы адначасова свае мастацкія здольнасці і творчыя памкненні.<br>Сёння народнае мастацтва таксама не страціла сваіх аматараў і перайmальнікаў. З 2004 года майстры народных мастацкіх рамёстваў аддзела народнай творчасці, культурна-забаўляльнай дзейнасці і рамёстваў дзяржаўнай установы “Астравецкі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці” праводзяць заняткі па саломапляценні, інкрустацыі і аплікацыі саломкай, роспісе па шкле, дрэве і тканіне, выцінанцы, мастацкай кераміцы, вышыўцы, вязанню. Вырабы з Астраўца ўпрыгожваюць святы гарадоў і вёсак Гродзеншчыны, рэспубліканскія кірмашы і выстаўкі, дзе майстры не толькі дэманструюць сваю творчасць, але і праводзяць майстар-класы для розных узроставых і сацыяльных груп насельніцтва.<br>Запрашаем пазнаёміцца з намі бліжэй!<br>*Метадычны аддзел ДУ “Астравецкі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”; 8(01591)75220* |